# УСТАНОЎЧАЯ ДАМОВА
## аб сумеснай дзейнасці чальцоў Выбарчай камісіі па правядзенні выбараў у Каардынацыйную Раду

5 красавіка 2024 года

г.Варшава

*Зыходзячы з памкненняў беларускай грамадзянскай супольнасці аб стварэнні выбарнага прадстаўнічага органа,*

*Шануючы шматвяковыя традыцыі прадстаўнічай дэмакратыі Вялікага княства Літоўскага і прагнучы ўзнаўлення канстытуцыйнага ладу ў Беларусі,*

*Прытрымліваючыся фундаментальных свабод і правоў чалавека, а таксама стандартаў правядзення дэмакратычных выбараў,*

*Аддаючы прыярытэт персанальнай бяспецы выбаршчыкаў,*

*На падставе Палажэння аб выбарах у Каардынацыйную Раду,*

Мы, Выбарчая камісія па правядзенні выбараў у Каардынацыйную Раду ў асобах Андрэя Атаманчука, Яраслава Бекіша, Дзмітрыя Лазавіка, Альвіны Мінгазавай, Алены Прыходзька і Алены Філатавай (далей – Выбарчая камісія), заключылі дадзеную дамову аб наступным.

1. Выбарчая камісія ствараецца выключна ў мэтах правядзення выбараў у Каардынацыйную Раду на падставе яе рашэння ад 5 красавіка 2024 года. Кампетэнцыя і дзейнасць Выбарчай камісіі вызначана Палажэннем аб выбарах у Каардынацыйную Раду (далей - Палажэнне) і не можа супярэчыць яму.
2. Выбарчая камісія абірае са свайго складу Старшыню таемным галасаваннем простай большасцю галасоў, аб чым прымаецца рашэнне.
3. Правядзенне пасяджэнняў Выбарчай камісіі адбываюцца па меры неабходнасці, але не радзей за адзін раз на тыдзень.
4. Склад Сакратарыята, парадак яго фармавання і ўзаемадзеяння з Выбарчай камісіяй вызначаюцца апошняй.
5. Выбарчая камісія распрацоўвае палітыку бяспекі правядзення выбараў у Каардынацыйную Раду ў адпаведнасці з Агульным рэгламентам абароны персанальных дадзеных (GDPR) Еўрапейскага Саюза і зацвярджае яе сваім рашэннем.
6. Выбарчая камісія самастойна арганізоўвае і вызначае метады правядзення галасавання і падліку галасоў падчас выбараў у Каардынацыйную Раду. Пры неабходнасці да працэсу выбараў у Каардынацыйную Раду могуць быць запрошаны спецыялісты ў галіне лічбавых тэхналогій пры ўмове падпісання імі палітыкі бяспекі.
7. Выбарчая камісія забяспечвае ўмовы для назірання за выбарамі, якое ажыццяўляецца ў адпаведнасці з палітыкай бяспекі.
8. Чалец Выбарчай камісіі павінен паведамляць сродкам масавай інфармацыі толькі праўдзівую інфармацыю, якая датычыцца выбараў у Каардынацыйную Раду, пры ўмове выканання патрабаванняў палітыкі бяспекі.
9. Дзеянні чальцоў Выбарчай камісіі, не ўрэгуляваныя пісьмовымі рашэннямі, ажыццяўляюцца ў адпаведнасці с прынцыпамі разумнасці і добрасумленнасці.

Андрэй Атаманчук

Яраслаў Бекіш

Дзмітрый Лазавік

Альвіна Мінгазава

Алена Прыходзька

Алена Філатава